# Агляд падзей тыдня паводле афіцыйных крыніц ЕС

## Анонсы падзей 7-13 мая

**9 мая** – Дзень Еўропы 2012 ці 62-ыя ўгодкі Дэкларацыі Шумана. З гэтай нагоды ў Фларэнцыі адбудзецца другая штогадовая канферэнцыя “The State of the Union”. Выбітныя вучоныя, палітыкі і нефармальныя лідары абмяркуюць пытанні еўрапейскай эканомікі, ролю ЕС як глабальнага актара, а таксама энергетычную палітыку Еўрасаюза. Падрабязней

**11 мая** – Еўракамісія апублікуе свой веснавы эканамічны прагноз на 2012-2013 гг., у тым ліку па паказчыках валавага ўнутранага прадукту, інфляцыі, занятасці і дзяржаўных фінансаў для ўсіх 27 краін ЕС і асобна для краін еўразоны. Ранейшы прамежкавы прагноз

**11-12 мая** – у Ялце адбудзецца Саміт лідараў стран Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы. 15 еўрапейскіх прэзідэнтаў былі запрошаныя на мерапрыемства, але 12 з іх адмовіліся прыехаць. Адна з асноўных прычын – неналежнае абыходжанне са зняволенай Юліяй Цімашэнка.

## Падзеі мінулага тыдня

### Эштан: аднаўленне чыгуначнага руху праз Прыднястроўе – цудоўная навіна для бізнесу і людзей

Высокі прадстаўнік ЕС па замежных справах і палітыцы бяспекі Кэтрын Эштан адзначыла аднаўленне грузавых чугуначных перавозак праз Прыднястроўскі рэгіён Малдовы як “найбольш значны крок на шляху аднаўлення даверу паміж бакамі прыднястроўскага канфлікту”. У сваёй заяве Эштан адзначыла, што гэта “цудоўная навіна для бізнесу і людзей, якія жывуць на двух берагах Днястра”, і дадала: “Мы рады, што тэхнічны досвед ЕС дапамог выпрацаваць гэта практычнае рашэнне”.

### Беспрацоўе ў еўразоне дасягнула 10.9%

Беспрацоўе ў еўразоне ў сакавіку гэтага года дасягнула ўзроўню 10.9%, што на 0.1% больш, чым у лютым, і на 1% больш, чым у сакавіку мінулага года. У цэлым у ЕС 10.2% працаздольнага насельніцтва не мелі працы ў сакавіку, і гэты паказчык застаўся нязменным у параўнанні з лютым 2012 года. У сакавіку мінулага года ў ЕС было 9.4% беспрацоўных.

### Працэнтныя стаўкі Еўрапейскага цэнтрабанка застануцца нязменнымі

Прэзідэнт Еўрапейскага цэнтрабанка Марыа Драгі 3 мая агучыў рашэнне пакінуць працэнтныя стаўкі ЕЦБ нязменнымі. Ён адзначыў, што эканамічныя паказчыкі за першы квартал пацвярджаюць стабілізацыю эканамічнай актыўнасці, хоць і на нізкім узроўні, аднак Драгі чакае яе павольнага аднаўлення цягам бягучага года. Згодна прагнозам ЕЦБ, узровень інфляцыі застанецца вышэй 2%.

## ЕС і АБСЕ правялі трэнінгі для 14, 000 сябраў выбарчых камісій у Арменіі

ЕС і АБСЕ правялі сумесныя трэнінгі для прыблізна 14 тысяч сябраў выбарчых камісій у Арменіі. Трэнінгі адбываліся перад парламенцкімім выбарамі і сталі часткай праекта па прывядзенні выбарчага працэсу Арменіі ў адпаведнасць з міжнароднымі стандартамі. Праект ажыццяўляўся Офісам АБСЕ ў Ерэване і быў прафінансаваны Еўрасаюзам у аб'ёме 1,7 млн. еўра.

## Як зрабіць Інтэрнет больш бяспечным і карысным для дзяцей і падлеткаў

Еўрапейская Камісія агучыла план, накіраваны на выпрацоўку неабходных навыкаў і прыладаў, якія патрэбны дзецям і падлеткам для бяспечнага карыстання Інтэрнетам. Новая стратэгія будзе спрыяць попыту на інтэрактыўны, творчы і адукацыйны змест у сусветнай павуціне. Праект будзе ажыццяўляцца ў супрацоўніцтве з Еўракамісіяй, краінамі ЕС, аператарамі мабільнай сувязі, вытворцамі тэлефонаў, і правайдэрамі сацыяльных сетак.

**Відэа тыдня**

Апошні дзень візіта Высокага прадстаўніка ЕС па замежных справах і палітыцы бяспекі Кэтрын Эштан у М’янму і яе каментар па выніках візіта